

Інфармацыйная культурна-грамадская газета Гарадоччыны



№ 1 (208) СТУДЗЕНЬ 2016 ГОДА

БЕЛАРУСКАЕ ПАЖАДАННЕ

Будзь вясёлы, як сват на вяселлі, здаровы, як вада, багаты, як зямля.

У ЦЭНТРЫ ЎВАГІ

ПАСЛЯ ЦЫКЛОНУ ГАРАДОК ВЫЗВАЛЯЕЦЦА АД СНЕГУ

Прапануем увазе чытачоў сайта фотарапертаж аб становішчы са снегам у Гарадку раніцай 13 студзеня пасля цыклону "Даніэла", які гаспадарыў над краінай у панядзелак.

Цыклон "Даніэла" самы вялікі ўдар нанёс па Віцебску, дзе сёняшняй раніцай снежны пакроў дасягнуў па дадзеных сіноптыкаў 32 см. У Гарадоцкім раёне па дадзеных метэстанцыі Езярышча яго вышыня склала 28 см.

Дарожныя службы з самай раніцы пачалі працу па ачыстцы дарог, вуліц ад удару цыклона. За панядзелак на дарогах і вуліцах Гарадка надзвычайных сітуацый не здарылася.

Раніцу аўторка Гарадок сустрэў у вялікіх суметах і змаганні са снегам. Аўтастанцыя Гарадка ўжо знаходзілася ў ачышчаным стане і працавала ў штатным рэжыме. Аўтобусныя прыпынкі ў райцэнтры былі таксама расчышчаны. Вось толькі падыход да іх часам пасажыры павінны былі рабіць самі.

Між тым прадаўцам і пакупнікам на рынак Гарадоцкага райспажыўсаюза даводзілася раніцай прабірацца праз суметы.

Самай праблемнай дарогай для пешаходаў пад час снегападаў становіцца Невельская шаша, дзе камунальнікі не спяшаюцца вызваляць пешаходную дарожку ад снегу. Між тым вучні і настаўнікі СШ №2, грамадзяне з правабярэжнай часткі Гарадка вымушаны пераадольваць суметы або ісці па праезнай частцы, каб прайсці да школы або ў цэнтар. Відавочна, што гэты ўчастак дарогі павінен быць аднесены да першачарговай уборкі пад час снегападу.

Да першачарговай уборкі аднесена дарога праз плаціну, якая злучае цэнтр з мікраёнам вул. Юбілейная.

У гэтым мікраёне раніцай была прачышчана толькі цэнтральная дарога, а прыборка снега каля дамоў заставалася на сумленні жыхароў. Па вялікаму рахунку не паруплíся пра ўборку снега толькі жыхары інтэрната вакол якога снег прытаптаны толькі нагамі.

У самай цэнтральнай частцы Гарадка на вуліцах Савецкай і Валадарскай снегу раніцай яшчэ хапала. Прайсці магчыма вольна тут да крамаў і устаноў падыходы да якіх расчышчаны працуючымі работнікамі. А вось дошка аб'яў яшчэ была ў снежным палоне.

У змаганні са снегам дарожнікі і камунальныя работнікі правядуць бліжэйшыя дні. І сітуацыя са снегам паляпшаецца штогадзінна. Яшчэ каля 9 гадзін раніцы паркоўка каля крамы "Ганна" па вул.К. Маркса патанала ў снезе, а ўжо каля 10 гадзін яна была расчышчана.

Для ўборкі снегу камунальнікі у Гарадку гатовы задзейнічаць 12 адзінак тэхнікі, каб навесці парадак на 59 км дарог райцэнтра.

Справа ўборкі стаянак і прыдамавых тэрыторый вялася б хутчэй, каб на іх не было пакінутых безнаглядных машын. Часам гэтыя машыны не дазваляюць ачысціць дарогу ад снегу, бо месяцамі знаходзяцца ў аварыйным стане на стаянцы.

Леанід Гаравы

фота на сайце *http://haradok.info*

ЗНАЧНА БОЛЬШ НАВІНАЎ ПРА ГАРАДОК НА HARADOK.INFO

ПРАДПРЫМАЛЬНІЦТВА

80% ПРАДПРЫМАЛЬНІКАЎ СПЫНІЛА ПРАЦУ

4 студзеня на прамысловым рынку Гарадоцкага райспажыўсаюза працавала толькі шостая частка індывідуальных прадпрымальнікаў. І праблема не ў моцных халадах, а ў не магчымасці выканаць патрабаванне ўладаў аб сэртыфікацыі з 1 студзеня пэўных прамысловых тавараў.

Увядзенне ў дзеянне з 1 студзеня 2016 года палажэння указа №222 кіраўніка краіны аб абавязковай сэртыфікацыі прадаваемых тавараў лёгкай прамысловасці прывяло да спынення працы абсалютнай большасці гандлёвых кропак на рынку г. Гарадка. Па стану на 4 студзеня на рынку працавала толькі 11 гандлёвых кропак з 63 існуючых.

Працавалі найперш тыя кропкі, якія маюць дакументы аб сэртыфікацыі сваіх тавараў ад беларускіх аптавікоў або такія сэртыфікаты для іх тавараў яшчэ не прыдугледжаны. На рынку магчыма набыць аўтазапчасткі, сантэхніку, металёвыя вырабы, рыбныя прыналежнасці і вельмі абмежаваны асартымент тавараў беларускай вытворчасці.

Прыняцце ўказа №222 наконт выканання тэхнічнага рэгламенту мытнага саюзу Расіі, Беларусі і Казахстана найперш балюча ўдарыла па беларускіх прадпрымальніках, бо ў Расіі і Казахстане глядзяць сквозь пальцы на гэты тэхнічны рэгламент.

Палітолаг Валер Карбалевіч на сайце "Радыё Свабода" так кампетэнтна пракаменціраваў існуючую праблему: "тут паўстала другая праблема. Яе агучыў Аляксандар Лукашэнка падчас візыту на «Экспабел» у сакавіку 2015 году. Ён растлумачыў, што ІП «забілі беларускую лёгкую прамысловасьць». Вось з-за чаго ўвесь сыр-бор. Як вядома, беларуская лёгкая прамысловасьць ляжыць у руінах,нягледзячы на бясконцыя бюджэтныя датацыі. Колькі разоў Лукашэнка наведваў прадпрыемствы «Камволь» і «Сукно», патрабаваў навесьці парадак, пагражаў турмой, абяцаў дапамогу, але выніку ніякага. Вось месяц таму было прынятае рашэньне вылучыць зь дзяржбюджэту чарговыя 5 млн эўра безнадзейнаму банкруту ААТ «Камволь».

На першы погляд, здавалася б, якая розьніца, хто застанецца бяз працы — работнікі гэтых прадпрыемстваў лёгкай прамысловасьці або 120 тысяч ІП? Усе ж грамадзяне Беларусі. Але гэта толькі на першы погляд. Насамрэч розьніца вялізная.

Прадпрыемствы лёгкай прамысловасьці—альбоцалкам дзяржаўныя, альбо вялікая доля іх акцыяў належыць дзяржаве. А ІП — незалежныя ад дзяржавы. І дзеля захаваньня дзяржаўнага сэктару ў прамысловасьці ўлады гатовыя разарыць прыватных прадпрымальнікаў. Бо апошнія самой сваёй прысутнасьцю разбураюць патэрналісцкую сацыяльную мадэль, паводле якой усё насельніцтва павінна залежаць ад дзяржавы, увесь час нешта прасіць, а вярхоўны ўладар вялікай лыжкай дзеліць «па справядлівасьці». Залежны народ — паслухмяны. Калі ўжо і дапускаць прыватнікаў, то буйных, напрыклад, уласьнікаў гандлёвых сетак, бо зь імі лягчэй мецьсправу,лёгказаангажаваць, прымусіць, запужаць, трымаць на кручку.

Сёньняшняя сытуацыя з ІП — гэта і адказ тым, хто яшчэ спадзяецца на рынкавыя рэформы, якія па сваёй прыродзе павінны скарачаць долю дзяржаўнага сэктару ў эканоміцы і павялічваць ролю прыватнага бізнэсу. Дык вось не. У гэтай краіне час спыніўся."

Індывідуальныя прадпрымальнікі, нязгодныя з указам № 222, які, як яны сьцьвярджаюць, не дае магчымасьці гандляваць нехарчовымі таварамі без дакумэнтаў аб паходжаньні, зьбіраюцца на антыкрызісны форум 11 студзеня. Але яшчэ да форуму стыхійна ладзяцца мясцовыя сходы.

Старшыня грамадзкага аб'яднаньня «Пэрспэктыва» Анатоль Шумчанка распавёў Свабодзе, што мае дачыненне толькі да падрыхтоўкі антыкрызіснага форуму 11 студзеня, а мясцовыя сходы — ініцыятывы самых прадпрымальнікаў, што не каардынуюцца «зьверху»: "…Адзінае, што мы робім, гэта арганізуем антыкрызісны форум і маніторым сытуацыю, трымаем сувязь з усімі. А што ў галаве чалавека, мы не ведаем.

Гэта галоўная пагроза для цяперашніх уладаў. Бо змагацца з арганізаваным пратэстам яны навучыліся. А змагацца са стыхійным пратэстам — вось гэта для іх вельмі сур'ёзная праблема».

Леанід Гаравы

НАШЫ ЗАРОБКІ

НА НОВЫ ГОД БЕЗ ЗАРОБКАЎ

Нацыянальны статыстычны камітэт Беларусі прывёў дадзеныя аб пратэрмінаванай запазычанасьці па заробках у краіне па стане на 1 студзеня 2016 году. Асноўнымі даўжнікамі па заробках сталі арганізацыі Віцебскай вобласці. Тут іх 114 са 141 арганізацый краіны, якія маюць пратэрмінаваныя даўгі па выплаце заробкаў. У Гарадоцкім раёне засталіся тыя ж самыя даўжнікі.

Паводле афіцыйных крыніцаў, беларусам да Новага года ня выплацілі 60,5 мільярда рублёў на 141 прадпрыемстве.

Гэтыя даўгі ў чатыры разы меншыя, чым былі месяцам раней, але не на Віцебшчыне. Наша вобласць мае самыя вялікія даўгі па пратэрмінаваных выплатах заробкаў – 42,4 млрд. рублёў. На другім месцы горад Мінск, дзе 3 прадпрыемствы маюць даўгі аж на 11,4 млрд. рублёў, а на трэцім месцы Мінская вобласць, дзе 20 арганізацый маюць даўгі на 5,3 млрд. рублёў.

На пачатак года няма даўгоў у арганізацый Берасцейшчыны, Гродненшчыны, Магілёўшчыны і толькі адна арганізацыя ў Гомельскай вобласці.

У Гарадоцкім раёне па ранейшаму ёсць традыцыйныя даўжнікі: ААТ "Гарадоцкі льназавод", ААТ "Гарадоцкі РАПЗ", КУСГП "Сціпанавічы, КУСГП імя Дзімітрава, КУСГП імя Свердлава, ДКУБП "Гарадоцкая ПМК-51".

Сярод раёнаў Віцебшчыны па ранейшаму найбольшая колькасць даўжнікоў у Мёрскім раёне – 14, а ў Шумілінскім – 10, Глыбоцкім, Талачынскім раёнах – па 9 прадпрыемстваў даўжнікоў.

Л. Антонаў

Аб'ява

Аператыўная інфармацыя аб падзеях Гарадоччыны, рэгіёна і больш, чым у газеце, зараз па-беларуску і па-расейску з'яўляецца на новым Інтэрнэт рэсурсе: http://haradok.info

****

Наша газета "Гасцінец" пачала размешчацца на партале http://haradok.info ў раздзеле "Газета "Гасцінец", дзе ствараецца архіў за мінулыя гады.

****

Каб атрымліваць кожны нумар газеты «Гасцінец» паведаміце рэдакцыі аб гэтым – і вы яго атрымаеце. Калі ўжо не жадаеце атрымліваць выданне, то патэлефануйце у рэдакцыю.

РЫНАК ПРАЦЫ

ШМАТ САСТАРЭЛЫХ ДАНЫХ

У базе вакансій Міністэрства працы і сацыяльнай абароны па Гарадоцкаму раёне толькі 30 вакансій былі абноўлены за апошнія 30 дзён. База яшчэ ўтрымлівае вакансію, якая падавалася ў верасні 2015 года.

Першапачатковаяінфармацыя аб вакансіях у Гарадоцкім раёне сведчыць, што на 11 студзеня 2016 года ў раёне маецца 56 вакансій на 76 працоўных месцаў. Але азнаямленне з гэтай базай даных паказвае, што за апошнія трыццаць дзён было абноўлена толькі 30 вакансій, а астатнія 26 састарэлі. Пры гэтым дзве з іх датуюцца лістападам, а самая старая была пададзена 16 верасня ад Халамерскай сельскай бальніцы на вакансію фельшара з акладам у 2,3 млн. рублёў.

Сярод абноўленых прапаноў першае месца па традыцыі належыць свінакомплексу "Паўночны" з аграгарадка Пальмінка. Тут прапануюць 22 працоўных месца і самы вялікі дэфіцыт на прадпрыемстве – трактарыстаў-машыністаў – 6 чалавек з акладам па 4,5 млн. руб. Гарадоцкаму лягасу патрабуецца 11 працаўнікоў, а цэху "Віцебчанка" – 5.

Па ранейшаму з пачатка снежня ў базе выкансій прысутнічаюць тыя ж самыя прапановы ад філіяла "Віраўлянскі" ЗП "Дзецкасельскі-Гарадок" на вакансіі з заробкам ў 9,743 млн. рублёў. Такія заробкі прапануюцца намесніку дырэктара філіяла па адміністрацыйна-гаспадарчай часткі, а таксама загадчыку малочнатаварнай фермы, якая зараз філіялам будуецца ў в. Селішча.

Гарадоцкі аддзел адукацыі, спорту і турызму па ранейшаму шукае двух псіхолагаў на 0,5 стаўкі ў Межанскую і Бычыхінскую школы (заробак – 1,208 млн. руб.), намесніка дырэктара па выхаваўчай працы ў СШ№1 на стаўку (заробак – 2,4 млн. руб.), а таксама інжынер-механіка (заробак – 2,18 млн. руб.). Тыя ж самыя вакансіі адкрыты і ў Гарадоцкай санстанцыі з нагрузкай больш стаўкі: бактэрыёлаг на 1,25 ст. – 5,095 млн. руб. і эпідэміялаг 1,5 ст. – 4,962 млн. руб..

Л. Антонаў

Крыніца: *vacancy.mintrud.by*

ЦІКАВЫ ФАКТ

КАЧКІ ЗАЗІМАВАЛІ НА ГАРАЖАНЦЫ

Каля дзесяці пар качак – самак і самцоў – магчыма назіраць гэтай зімой на рэчцы ў цэнтры Гарадка.

Дзве мінулыя цёплыя зімы мусіць паспрыялі таму, што і на гэту зіму каля дзесяці пар качак засталіся на Гаражанцы каля плаціны. Менавіта ў гэтым месцы Гаражанка яшчэ не замерзла і вадаплаваючыя птушкі здабываюць корм у вадзе – сваёй стыхіі.

Шэрыя качкі-самкі і каляровыя качкі-самцы бавяць час каля плаціны, часам выбіраючыся на заснежаны лёд. Надыходзячыя халады ставяць рубам пытанне аб выжыванні качак у цэнтры Гарадка. Мусіць эколагі павінна патурбавацца пра іх выжыванне ў халодны зімовы час.

Л. Антонаў

ТУРЫСТАМ

ПОРТАЛ TUT.BY ПИШЕТ ПРО ПЯТЬ ПРИЧИН, ЧТОБЫ ПОБЫВАТЬ В ГОРОДКЕ.

Наше первое путешествие в новом году в рамках проекта «Страна» — в Городок Витебской области. Уже от одного названия этого небольшого населенного пункта веет уютом. Интересный топоним и местная река — Горожанка. А от названия озера — Луговое — пахнет цветами, и хочется поскорей попасть из зимы в лето.

Потому что зимой в Городке очень хо-о-лодно, бр-р! Прохладней, чем где, в этих краях и в другое время года: здесь белорусский «северный полюс». Но об этом чуть позже — в наших традиционных пяти причинах.

Населенный пункт впервые упоминается в 1128 году — по случаю военного похода киевского князя Мстислава Владимировича в Полоцкую землю. В летописях второй половины XIII века упоминается как «Городок около Полоцка». На карте 1613 года отмечен как местечко Витебского воеводства Великого княжества Литовского. В XVII веке на правом берегу реки Горожанки построили бастионный замок с пятью оборонительными башнями и рвом.

Причина первая. Музей с «Погоней» и уникальные традиции

Возле центральной площади находится одно из красивейших зданий в Городке — районный краеведческий музей. В фонде музея — около 45 тысяч предметов. Здесь богатейшая этнографическая коллекция, экспозиции, рассказывающие о природе, истории, людях этого региона Витебщины.

Среди экспонатов есть и необычные «подарки» городокской земли — каменные фаллосы.

Большую часть — 16 экземпляров — в 1990 году учреждению культуры передал педагог и краевед Борис Гордин из деревни Бычихи. Позже коллекция пополнилась еще тремя экспонатами, которые в музей принесли жители райцентра. Люди находили их на своих огородах.

А еще Городок удивляет талантами своих жителей. Местное ажурное ткачество «Кисея» входит в список нематериального культурного наследия Беларуси. Особенность этих полотенец, скатертей — в разреженной структуре. Изделия ткут из отбеленных льняных нитей, а их края украшают кружевами, связанными крючком.

В Городокском Доме ремесел работает мастерская, где можно познакомиться с историей ажурного ткачества и изучить процесс.

И еще одним уникальным обрядом славен этот край. В Городокском районе с давних пор существует игра «Похороны деда». Это народная пародия на настоящее прощание с умершим. Происходит ритуал всегда в первый день Масленицы.

Собираются сельчане, в основном пожилые женщины, и веселятся. Если в других местах на Масленицу сжигают чучело зимы, то на Городоччине «хоронят» куклу в рост человека, которая символизирует мифологического деда-предка. Его «похороны» — и есть встреча весны.

Причина вторая. Константин Вереницын и «Гарадоцкі Парнас»

Один из самых известных уроженцев этого края — Константин Вереницын, поэт, автор самого популярного в XIX веке белорусского произведения — сатирической поэмы «Тарас на Парнасе». Он родился в деревне Островляны.

Язык поэмы про «палясоўшчыка» (лесника) Тараса — живой витебский диалект того времени. Многие помнят со школьной скамьи начало его приключений: на охоте Тарас провалился в нору и попал в потусторонний мир, на Парнас. Там он встретился с античными богами и писательской элитой.

Ці знаў хто з вас, браткі,
Тараса,
Што палясоўшчыкам служыў?
На Пуцявішчы, у Панаса,
Ён там ля лазні блізка жыў.
Што ж,
чалавек ён быў рахманы,
Гарэлкі ў губы ён ня браў,
Затое ў ласцы быў у пана —
Яго пан дужа шанаваў.
Любіла тож Тараса й паня,
І войт ні разу не збрахаў,
Затое ж ён балота з рання
Да цёмнай ночы пільнаваў.
Чуць золак —
стрэльбу ён за плечы,
Заткне сякеру за пояс, —
Заўсёды ходзіць бор сцярэгчы
Ды птушак біць з ружжа
Тарас.
Хадзіў ці многа ён, ці мала,
Ды толькі нешта адзін раз
Бяда ў бары яго спаткала…
Во як казаў нам сам Тарас.

В Городке, возле краеведческого музея, установлены памятные знаки, посвященные поэме и ее автору. С 2008 года в райцентре проводится праздник народного творчества, белорусской поэзии и фольклора «Гарадоцкі Парнас» в честь Константина Вереницына — обычно в первых числах июня.

В сквере возле здания райисполкома находится скульптура, посвященная поэме «Тарас на Парнасе». Памятник представляет собой открытую книгу, на фоне которой стоит веселый лесник. У его ног сидит трогательная белочка. Кстати, установили скульптуру только со второй попытки.

Причина третья. Старая почтовая станция и застройка

В 2014 году Городок должен был принять 19-е по счету республиканские «Дажынкі». Райцентр начали приводить в порядок чуть ли не за год до праздника, чиновники распорядились, чтобы строители работали «разумно, толково, эффективно и дешево». При этом местные власти не скрывали: «Город трудный — тут никто сто лет ничего не делал». Работа кипела!

Потом президент отменил проведение фестиваля в маленьких населенных пунктах страны. Городокские «Дажынкі» из республиканских переформатировались в региональные. Но подготовка к празднику точно пошла райцентру на пользу: он неузнаваемо похорошел. Сейчас это опрятный, ухоженный, приятный глазу городок.

В центре Городка, возле главной площади, сохранилась застройка конца XIX — начала XX веков. Памятники архитектуры также отреставрировали к «Дажынкам». Красивый одноэтажный дом с аптекой — один из самых старых в городе.

В Городке три храма: Благовещенский костел и две православные святыни — Троицкая церковь и храм в честь апостола Андрея Первозванного.

Под Свято-Андреевский храм отдали историческое здание — бывшую почтовую станцию (середина XIX века). С условием, что новые хозяева сохранят облик памятника архитектуры.

Раньше на почтовых станциях почтальоны и путешественники меняли лошадей. В Беларуси осталось 37 таких памятников. Они построены в 1840—1860-е годы по типовому проекту. Интересный рассказ про эти сооружения — здесь.

Про судьбу станции в Городке уже в послереволюционное время нам рассказала служительница церковной лавки:

— До войны в этом здании была машинно-тракторная мастерская, потом — жилье, четыре квартиры, в них жили работники ремзавода. Лет 10 назад здание отдали православной епархии. Начали делать ремонт — постепенно, как получалось по финансам. Отремонтировали часть здания, здесь сейчас идут службы. В прошлом году поставили купол. Справа от входа сделали пристройку, там будет алтарь.

Похожая станция, также памятник архитектуры первой половины XIX века, сохранилась в деревне Кузьмино Городокского района. Ее отреставрировали и открыли здесь придорожную гостиницу.

Городок запомнится вам своим рельефом: здесь часто идешь то в горку, то с нее. Особенно это чувствуется на Невельском шоссе, на мосту через Горожанку.

Причина четвертая. Наш «северный полюс»

Соберетесь в Городок — оденьтесь потеплее. Зима на Витебщине, а особенно на Городоччине, долгая, суровая, погода капризная — когда в других областях уже цветут цветы и идет посевная, тут еще лежит снег.

В Городокском районе находится и белорусский «северный полюс» — городской поселок Езерище. Это главный рекордсмен в сводках погоды. Здесь фиксируют самые сильные морозы и снегопады, самые холодные осенние ночи.

Почему здесь холоднее всего, синоптики объясняют просто: Городокский район находится на северо-востоке страны и обычно первым встречает холодный арктический воздух. Через двое-трое суток он выхолаживается максимально, поэтому и температуры в этих местах самые низкие.

Местные старожилы вспоминают, что иные зимы выдавались такими студеными, что птицы на деревьях возле дома сидели не шелохнувшись. До них даже можно было дотронуться! Бедные пичуги не улетали, только переминались с лапки на лапку.

Поговаривают, что наблюдали здесь и совсем уж необычное для наших широт явление — северное сияние.

Кстати, окрестные деревни имеют «зимние» названия: Меховое, Дрожаки, Морозово, Студенка…

Городокчане, несмотря на то что живут в суровом краю, — люди радушные, богатые на таланты и щедрые на сердечную теплоту. Поэтому в Городок приезжать всегда приятно.

Вот, например, Алла Пашук превратила свой двор в настоящую рождественскую сказку. На стенах дома — оригинальные веночки, гирлянды, иллюминация. На подоконниках примостились милые снеговички и елочки. Нарядно украсила хозяйка и тую во дворе, рассказывает местная газета.

(сокращено)

Татьяна Матвеева

КОНСЕРВАЦИЯ БЕЛАРУСИ

ЛУКАШЕНКО УПОВАЕТ НА НЕБЕСА

Приход в храм на православное Рождество белорусский официальный лидер традиционно использовал для политических заявлений. По его словам, демократии в Беларуси не меньше, чем у других; рушить ничего не будем; все, что создано народом, не будет продаваться за бесценок; наконец, самое главное право — это право жить.

Вообще тема мира и стабильности доминировала, что легко объяснимо: в плане благосостояния предъявить электорату нечего, и завтра, судя по всему, пояса придется затянуть еще туже.

Поэтому в речах, прозвучавших 7 января из уст Александра Лукашенко на рождественском богослужении в Свято-Духовом кафедральном соборе Минска, последовательно проводилась мысль: тут не до жиру, слава богу, что нет войны.

Ну, и подтекстом — смекните, мол, кого следует благодарить за мудрую политику. И не возбухайте особо, что кошелек тощает. Вон украинцам еще хуже.

Прошла весна, настало лето, спасибо партии за это

«Лишь бы не было войны» — это последовательная пиаровская линия белорусского руководства на фоне вхождения страны в глубокий экономический кризис.

В сентябре, перед президентскими выборами, в такомже духе провели «Молитву за Беларусь», поставив в центре мероприятия главного светского начальника. А перед Новым годом президент даже детям на елке твердил про украинских беженцев, подчеркивая, что «наше главное достояние — это мир, который мы сберегли».

Вообще-то войны на нашей земле нет уже более семи десятилетий. Бог миловал даже при Советском Союзе, когда БССР представляла собой огромный арсенал ядерного оружия и, соответственно, была объектом тщательно спланированных ударов с другой стороны в случае, если начнется заварушка по полной программе.

Теперь же той биполярной схемы нет. В нашей конституции как цель записан нейтральный статус. Другое дело, что на практике тесная военная интеграция с Москвой отдалила нас от этой цели.

И вот если Владимир Путин продавит-таки размещение в Бобруйске российской авиабазы (которая способна стать аэродромом подскока и для ядерных ракетоносцев), то Беларусь рискует вернуться во времена холодной войны и снова стать целью ответных ударов.

Но этот риск — прямое следствие слишком далеко зашедших интеграционных игр с Кремлем, в которые уже двадцать лет играет нынешнее белорусское руководство. Так что особо благодарить его тут не за что.

Демократию уже построили. Вольно, можно курить

Да, после Крыма чувство самосохранения у властей сработало. В награду за особую позицию по Украине Минск получил заморозку санкций и перспективу нормализации отношений с Евросоюзом и США.

Но этот чисто геополитический, вынужденный ход западников Лукашенко трактует хитро. Он заявил ныне в храме, что «…критики, которые нас подвергали избиению в этом вопросе, сегодня умолкли, убедившись в том, что и демократии, и прав человека в Беларуси не меньше, чем у других».

Правда, президент тут же свел на нет красиво выстроенный софизм, дав весьма убогую трактовку демократии и прав человека: «И самое главное — это право жить».

Живут и в тюрьме, однако это не означает, что там расцвет прав и свобод.

«Никому не нужна такая демократия, где каждый день на улице стреляют и убивают за год сотни тысяч людей», — добавил президент для пущей убедительности.

Но в демократических странах войн нет. Если же происходят кровавые теракты, то это отнюдь не порождение демократии, а человеконенавистничество, привнесенное извне. Если говорить об Украине (где жертв ужасно много, но все же не сотни тысяч), то она едва лишь собралась идти в Европу, как получила крымский и донбасский «подарочки» отнюдь не со стороны демократического мира.

(скарочана)

Александр Класковский

http://naviny.by

ВЫНІКІ

10 ДОБРЫХ НАВІНАЎ, ЗА ЯКІЯ ВАРТА ПАДНЯЦЬ КЕЛІХ

Праблема беларускіх навінаў у тым, што пазытыўным альбо негатыўным лічыцца тое, чаго не адбылося. Але ня толькі. Радыё Свабода згадала добрыя навіны сыходзячага году.

Год глябальнай беларускай культуры

Алексіевіч атрымала Нобэлеўскую прэмію. Гэта падзея ня толькі 2015-га, значыцца яшчэ давядзецца ацаніць. Агулам для беларускай культуры гэта год міжнародных дасягненьняў — Brutto Міхалка скарае Ўкраіну, Свабодны тэатар Брытанію і ЗША, Віктара Марціновіча ставяць у Вене.

Тое, чаго не адбылося

У Беларусі не паўстала расейскай вайсковай базы, краіна не ўцягнулася ў канфлікты, разьвязаныя Масквой і нават стала пляцоўкай для перамоваў па Ўкраіне. Менск наведалі Алянд і Мэркель, тут былі падпісаныя дамовы па ўрэгуляваньні крызісу на Данбасе. З таго, што магло здарыцца і добра, што так ня выйшла, — улады не пайшлі на стрымліваньне курсу рубля (прывітаньне, 2011-ты) і не арыштавалі апанэнтаў пасьля прэзыдэнцкіх выбараў (згадаем 2006-ты і 2010-ты).

А з таго, што не адбылося, але добра, што хаця б чакалася — магчымыя рынкавыя рэформы. Пра гэта чыноўнікі хаця б пачалі размаўляць.

Бліжэй да Эўропы

Раней быў распаўсюджаны выраз пра тое, што Беларусь адстае ад Захаду на 50 год. Магчыма, жывучы ва ўмоўным Глуску ў гэта цяжка верыць, але часавую адлегласьць усё ж трэба скарачаць — буйныя гарады жывуць у рытме сусьветных падзеяў: у нас стартуюць афіцыйныя продажы новых айфонаў, на беларускі рынак прыходзіць Uber, у сталіцы запускаюць 4G, разьліваецца бясплатная кола ў Burger King і KFC, а ўнівэрсытэты нарэшце ў Балёнскім працэсе. Які-небудзь год дакладна стане годам пераможнай глябалізацыі, калі ўсё стане відавочным, а пакуль яна проста істотна набліжаецца.

Бліжэй да суседзяў

Яно, вядома, непрыемна, што толькі апошнія дзесяць год з нашай сумеснай васемсотгадовай беларуска-віленскай гісторыі нам трэба віза, каб трапіць у Літву, але ў 2016 мы сталі бліжэй і да суседзяў: Лічба выдаваных візаў набліжаецца да мільёна ў год, па колькасьці «шэнгенак» мы даўно на першым месцы ў сьвеце, а сёлета толькі палепшылі паказчыкі. У нас паўстаюць візавыя цэнтры, а зь Менску штодня дзейнічаюць тры рэйсы ў Кіеў, адчыніліся кірункі ў Днепрапятроўск і Івана-Франкоўск. Вядзецца пра пачатак вяшчаньня ўкраінскага тэлеканалу.

Пагоня — побач!

Трэнд на нацыянальныя ўзоры на вопратцы і беларускую мову абазначыўся яшчэ ў 2014-м, а ў 2015-м бел-чырвоныя колеры пачалі паяўляцца паўсюль: на аўто і матацыклах, прыватных дамах, бялізьне, запалках, упакоўцы малака. БРСМ падтрымлівае Арт-сядзібу, тэлевядучая Ганна Бонд бярэ ўдзел у акцыі ў падтрымку кадэтаў з «Пагоняй» (не ў эфіры, але), Румас заступаецца за фанатаў у шаліках з нацыянальных гербам, бел-чырвона-белыя сьцягі мірна суіснуюць з чырвона-зялёнымі на выбарчых пікетах. Што будзе далей? Будзе лепш.

Вызвалілі і не пасадзілі

Ужо згадвалася, што добрай навіной можна лічыць тое, што новых палітвязьняў не зьявілася пасьля выбараў. А да выбараў выйшлі старыя. Упершыню за сем год у краіне не існуе людзей, якія за свае погляды знаходзяцца за кратамі. Мітынгі не разганялі падчас выбарчай кампаніі, але ня сталі разганяць і пасьля. Беларусь стала больш інтэнсіўна кантактаваць з Эўропай і ЗША, і што з гэтага атрымаецца — пытаньне году наступнага.

Музыкі ў «шэрым сьпісе»

Вольскі можа выступаць у Беларусі (прынамсі, у мэтро:)), Brutto — яшчэ не. Кіно Курэйчыка з музыкай ад Neuro Dubel ня толькі паказваюць у асноўнай праграме на дзяржаўным фэстывалі «Лістапад», але нават арганізуюць дадатковы паказ. Хаця наўрад ці ў Менску легальна дазволяць існаваць «Свабоднаму тэатру». То бок, пра скасаваньне цэнзуры казаць нік нельга, забароненыя творцы засталіся (а ў Лёндане нават прайшоў культурны марафон з гэтай нагоды, арганізаваны тым жа Свабодным тэатрам), але сьпісы дакладна ўжо не наскрозь чорныя. Магчыма, там стала больш адценьняў шэрага.

Рэйтынг

Аўтарытарны палітычны рэжым вучыць таму, што любыя навіны могуць успрымацца пазытыўна. Лукашэнка перамог на недэмакратычных выбарах і, магчыма, будзе кіраваць краінай рэкордныя 26 год. Гэта сумная навіна, але тое, што на гэтых выбарах, паводле вынікаў апытаньня НІСЭПД, ён перамог ня так «элегантна» — навіна добрая і абнадзейваючая. Фактычна апошняя значная палітычная навіна 2015-га — на выбарах за дзейснага прэзыдэнта прагаласавала каля траціны (!) беларусаў, а дэмакратычная кандыдатка Тацяна Караткевіч мела падтрымку мільёна выбаршчыкаў. Гэтыя дадзеныя карэлююць з дасьледаваньнем Gallup.

(скарочана)

http://www.svaboda.or

ПРАДПРЫМАЛЬНІЦКІ РУХ

ІП ЯК ЛЮСТЭРКА ГРАМАДЗТВА

Гучыць нямала разважаньняў пра тое, што можа абурыць беларусаў. Даволі распаўсюджаная думка, што беларускія грамадзяне ня будуць пратэставаць з-за каштоўнасьцяў, але калі закрануць іхнія матэрыяльныя інтарэсы, то тады нікому мала не падасца.

Гэтыя развагі варта прыгадаць цяпер, калі на вачах разгортваецца драма індывідуальных прадпрымальнікаў (ІП). Ня першы раз улада імкнецца выштурхаць гэты сацыяльны слой з эканомікі краіны. І ўвесь час ІП актыўна пратэставалі. І амаль заўсёды акцыі пратэсту заканчваліся тым, што ўлады саступалі, часткупатрабаваньняў ІП задавальнялі.

Цяпер гаворка ідзе фактычна пра ліквідацыю ІП як класы. Здавалася б, і адказ прадпрымальнікаў будзе адпаведны. Але ўсё адбываецца з дакладнасьцю да наадварот.

Чытаючы рэпартажы журналістаў незалежных мэдыяў з рынкаў пасьля Новага году, я зьвярнуў увагу вось на якую акалічнасьць. ІП адмаўляюцца кантактаваць з прадстаўнікамі СМІ, катэгарычна ня хочуць, каб іх здымалі на камэру, фатаграфавалі. Рэдкія прадпрымальнікі гатовыя нешта сказаць ананімна, пры ўмове, што іхнія прозьвішчы ні ў якім разе ня будуць названыя.

Здавалася б, чаго вы баіцеся? Вас штучна выкідваюць з рынкаў, пазбаўляюць магчымасьці працаваць, зарабляць. У такой сытуацыі чаго яшчэ можна баяцца, што можа здарыцца горшае? Але не — маўчаць, «каб чаго ня выйшла».

Парадокс сытуацыі ў тым, што ў выніку прэзыдэнцкага ўказу № 222 ня толькі ІП страцяць магчымасьць працаваць, але і гаспадары рынкаў рызыкуюць стаць банкрутамі. Бо калі прадпрымальнікі сыдуць, то хто будзе плаціць арэндную плату? Вось, напрыклад, дырэктар Чэрвеньскага рынку Генадзь Фінскі ў камэнтары журналісту «Нашай нівы» кажа: «Магу сказаць, што калі праект указу ў бліжэйшы час ня будзе зьменены, то мы, арганізацыя „Чэрвеньскі рынак", будзем падаваць на банкруцтва, паколькі ня зможам плаціць па рахунках». Тым ня менш у сваёй большасьці гаспадары рынкаў, як і ІП, дзейнічаюць паводле прынцыпу: будзем паміраць, але ціха.

Даволі паказальным стаў Антыкрызісны форум прадпрымальнікаў 11 студзеня. Найбольшы водгук у залі выклікала прапанова прадпрымальніцы Сьвятланы Калачовай з Гомеля, якая зьвярнулася да Лукашэнкі: «Вам фальшыва чыноўнікі прадстаўляюць інфармацыю. Каму выгадна сутыкаць ваш народ з уладай? Аляксандар Рыгоравіч, умяшайцеся ў сытуацыю. Пачуйце нас, калі ласка».

Калі вядомы актывіст прадпрымальніцкага руху Аляксандар Макаеў прапанаваў дзейнічаць больш рашуча і 18 студзеня правесьці мітынг пратэсту на Кастрычніцкай плошчы, грамада яго не падтрымала. Больш за тое, кіраўнік арганізацыі «Пэрспэктыва» Анатоль Шумчанка прапанаваў вывесьці Макаева з залі, аўдыторыя ўхваліла такі заклік. «Гэта подла... Гэта правакатары і падонкі», — заявіў Шумчанка.

Падаецца, нешта фатальна незваротнае адбываецца ў беларускім грамадзтве. І сытуацыя з ІП — толькі красамоўная ілюстрацыя да гэтага працэсу.

Валер Карбалевіч

ЭКАНОМІКА

ИТОГИ-2015: БЕДНОСТЬ, ЗАВИСИМОСТЬ И ЛОМКА

Нынешний год оголил реальные возможности белорусской экономики. Доходы населения в долларовом выражении упали практически до уровня кризисного 2011 года. В стране на разных уровнях началась «ломка» — новая жизнь вызывает глубокую депрессию, а жить по-старому уже не по карману.

Бедность наступает

Любая семья в стране заботится о своем благосостоянии, а без качественных импортных товаров, цены на которые привязаны к курсу доллара, обеспечить достойный уровень жизни вряд ли получится.

Так что правильно, на наш взгляд, оценивать доходы населения именно в условных единицах, которые реально отражают покупательную способность населения.

В долларовом выражении зарплаты белорусов за последний год существенно просели. Так, если в ноябре 2014 года средняя зарплата (по среднемесячному курсу) составляла 575,4 доллара, то в ноябре 2015 года — 379,6 доллара (к слову: четыре года назад, в декабре 2011-го, после резкой девальвации белорусы получали почти столько же — 342 доллара).

Как видим, в долларовом выражении средняя зарплата в стране за последний год снизилась более чем на 50%.

Белорусские аналитики не ожидают, что в будущем году доходы населения станут расти.

«Население получит либо снижение доходов в реальном выражении, либо их стагнацию», — считает экономист Антон Болточко.

В 2016 году произойдет минимум 10-процентное снижение доходов населения, придерживается пессимистичного прогноза руководитель Научного исследовательского центра Мизеса Ярослав Романчук.

«Беларусь отстает от России по темпам снижения реальных доходов населения. Поскольку рынок восточного соседа является основным нашим рынком сбыта, затраты предприятий на оплату труда придется снижать, чтобы поддерживать конкурентоспособность продукции в России», — аргументирует свой прогноз Ярослав Романчук.

По его мнению, уровень бедности в Беларуси в будущем году будет расширяться, и каждый пятый белорус может оказаться у ее черты.

К слову, российские эксперты также ожидают, что армия бедных в России может заметно расшириться.

«В случае затяжной рецессии почти 30% российских домохозяйств имеют высокие риски бедности и при неблагоприятных социально-экономических сценариях могут пополнить ряды бедных», — говорится в декабрьском докладе Аналитического центра при правительстве России.

Учитывая высокую зависимость Минска от Москвы, рост армии бедных в России неминуемо отразится и на Беларуси.

Последствия хронической зависимости

Уходящий год продемонстрировал высокую зависимость белорусской экономики от событий в России.

Помнится, еще в 2014-м белорусские власти пытались убеждать население в том, что девальвация в России не обязательно ведет к ослаблению белорусского рубля.

«Почему мы должны бежать за российским рублем?» — задавала риторический вопрос журналистам год назад тогдашняя глава Нацбанка Надежда Ермакова, комментируя необходимость ослабления белорусского рубля вслед за девальвацией в России.

В 2015 году от былой самостоятельности курсовой политики не осталось и следа. Ослабление российского рубля в уходящем году практически всегда приводило к девальвации белорусской валюты.

Высокая зависимость Беларуси от России в этом году подтверждается корреляцией и других ключевых показателей. При снижении ВВП России в январе-ноябре на 3,8% (оценка российского «Внешэкономбанка») белорусский ВВП упал на 3,9% за аналогичный период.

Таким образом, уходящий год наглядно продемонстрировал, что может происходить с формально независимой белорусской экономикой в случае проблем на восточном направлении.

«Александр Лукашенко на днях сказал, что будущий год будет очень сложным из-за обвала в России. Белорусские власти собственноручно вымостили дорогу к такому безрадостному сценарию развития событий. В будущем году у нас будет, вероятнее всего, рецессия на уровне 3-5%», — полагает Ярослав Романчук.

Экономист констатирует, что пока власти прилагают недостаточно усилий для того, чтобы переориентировать экономику на другие рынки.

«Когда мы 20 лет ориентировались на Россию, диверсификация требует времени, а пока не видно свидетельств в пользу того, что мы сможем это сделать», — констатирует Романчук.

(скарочана)

Дмитрий Заяц
http://naviny.by

НАША ПЕРАМОГА?

ПОБЕДУ НА ТУРНИРЕ ПРИНЕС ПРОФЕССИОНАЛЬНЫЙ ХОККЕИСТ

Рождественский международный турнир любителей хоккея на приз президента Республики Беларусь окончательно превращается в фарс. В финале этих соревнований вечером 7 января играли команды Александра Лукашенко и Финляндии. Победу одержали хозяева льда, но как!

Изначально за как бы любительскую дружину главы Беларуси играли 7 действующих хоккеистов: Леонид Гришукевич, Андрей Глебов, Алексей Плотников, Роман Сальников, Сергей Заделенов, Евгений Курилин и Вячеслав Лисичкин. По ходу турнира команду пополнили еще 3 профессионала: Александр Рядинский, украинец (!) Олег Шафаренко и швед Даниэль Корсо, на сомнительных основаниях получивший белорусское гражданство.

Но даже такими силами еле-еле удалось одолеть финских ветеранов. Скандинавы открыли счет уже в начале матча и выигрывали большую его часть. Лишь в конце второго периода защитник «Гомеля» Андрей Глебов восстановил равновесие. Ассистентские баллы в этой комбинации записали на свой счет Вячеслав Лисичкин и Даниэль Корсо, выступающие соответственно за гродненский «Неман» и минскую «Юность».

Победная шайба была заброшена в третьем периоде. Голевую атаку начал нападающий новополоцкого «Химика-СКА» Сергей Заделенов, продолжил Вячеслав Лисичкин, а завершил Даниэль Корсо. На последнем остановимся чуть подробнее: вообще-то по национальности этот хоккеист – канадец. С Беларусью его связывает непродолжительная побывка в минском «Динамо» (сезон 2011/12), а также женитьба на нашей соотечественнице.

Несколько месяцев назад Корсо объявился в «Юности», ради выступления за которую ему на сомнительных основаниях в сверхсрочном порядке предоставили белорусское гражданство. Такой вот «белорус-любитель».

Сам Лукашенко в финале на льду появлялся редко, особенно во втором и третьем периодах. Глава государства объяснил это проблемами со здоровьем (цитируется по БЕЛТА): «Я же на уколах играю. Колено повредил во второй игре, поэтому пришлось выходить не так часто, и не должен был мешать команде. Тренер сократил и начал тремя тройками играть, оставил самых быстрых, самых лучших, кому выходить на лед. Мы же здесь не показухой занимаемся, а работаем… XII Рождественский турнир запомнился мне тем, что появились очень сильные команды, которые могут спокойно играть в чемпионатах своих стран, в чемпионате Беларуси уж точно».

Лукашенко не преминул подчеркнуть якобы колоссальную популярность турнира у болельщиков: «Знаю, что даже лишний билетик спрашивали на матчи». В реальности же трибуны заполнялись посредством принудительного привода учеников школ и работников предприятий.

Интернет отреагировал на турнир с иронией и сарказмом. В частности, пользователь твиттера под ником Грустный Коленька написал: «Кстати, папа в хоккей может играть во много раз лучше, просто боится, что его заберут в НХЛ и не на кого будет оставить страну».

Михаил Миронович
http://gazetaby.com/

БЕЛАРУСКА-РАСЕЙСКАЯ ІНТЭГРАЦЫЯ

СПОР О СКИДКАХ НА ГАЗ

Беларусь и Россия не договорились о скидках на газ. Украина отказалась от предложенной Медведевым скидки на газ. Как сообщил заместитель министра энергетики России Анатолий Яновский, Беларусь в 2016 году будет получать газ по контрактной цене. Украина не будет покупать газ в России с предложенной скидкой — закупки в Европе обходятся дешевле, заявил премьер Арсений Яценюк

Беларусь и Россия не договорились о скидках на газ

«Не договорились», — прокомментировал ситуацию с обсуждением вопроса о скидках Яновский в ходе выступления на Гайдаровском форуме, сообщает Прайм-ТАСС. Российский чиновник также добавил, что «есть контрактная цена (по ней сейчас платят. — Ред.)».

О том, что цена на российский газ для Беларуси в 2016 году может «чуть-чуть» снизиться, в конце декабря минувшего года в эфире телеканала ОНТ заявил российский посол Александр Суриков.

«Сейчас $ 142 за тыс. куб. м. Где-то в районе от $ 140 до $ 135 может оказаться, потому что движение на мировых рынках — вниз», — сказал Суриков.

Ранее заместитель премьер-министра Беларуси Владимир Семашко отмечал, что сейчас есть все основания для снижения цены на газ.

«Мы полагаем, есть все основания говорить о том, что с 1 января должна существенно снизиться цена на газ. Хотя и сегодня она приемлемая: если быть точным, она составляет 142 доллара 37 центов за 1 тыс. кубометров», — сказал Владимир Семашко 16 декабря журналистам.

TUT.BY

Украина отказалась от предложенной Медведевым скидки на газ

Украина не будет покупать газ в России с предложенной скидкой — закупки в Европе обходятся дешевле, заявил премьер Арсений Яценюк. 1 января Дмитрий Медведев снизил цену для Украины с $230 до $212 за тысячу кубометров

Власти Украины отказались от предложенной Россией скидки на газ. Об этом заявил премьер-министр страны Арсений Яценюк.

«1 января они (РФ) выставили счет с ценой газа 212 долларов за тысячу кубических метров. Мы не покупаем газ в России, потому что мы покупаем газ в Европейском союзе дешевле, чем нам предложила Россия. Средняя стоимость приобретения газа в Европейском союзе — около 200 долларов», — передает заявление Яценюка «Интерфакс».

Сейчас в подземных газовых хранилищах накоплено 14 млрд куб. м газа. «Это на 2,3 млрд больше, чем в прошлом году», — добавил украинский премьер-министр.

Предоставить скидку на газ в размере $17,7 за тыс. куб. м распорядился председатель правительства России Дмитрий Медведев. 1 января 2016 года было опубликовано соответствующее постановление о размере пошлины при поставках газа. Таким образом, цена газа составила $212,3 за тыс. куб. м.

С начала 2015 года Украина увеличила закупки газа в Европе почти в два раза. Так, с начала 2015 года она закупила 10,2 млрд куб. м газа. Годом ранее — около 5,1 млрд куб. м, заявляла компания «Укртрансгаз». О том, что газ в Европе более дешевый, говорил и ранее глава «Нафтогаза Украины» Андрей Коболев. Газ Киеву продают «более десяти контрагентов».

«Европейский рынок газа очень изменился в последние годы. Он стал более гибким, в игру вступили новые поставщики, новые поставщики СПГ ожидаются в этом месяце в Европе. Все это позволяет нам покупать газ из различных источников», — заявил он.

Григорий Набережнов
http://www.rbc.ru

Заснавальнік і рэдактар: Гаравы Леанід Антонавіч

Адрас рэдакцыі: 211573, г. Гарадок, вул. Гагарына, д.30Б, кв.16. E-mail: 250318@list.ru
Тэл. 8-02139-5-08-52, маб. + 375(29)6723842 (V),
Газета выдаецца з сакавіка 1998 г.

Падпісана да друку 16.01.2016 у 18.15
Наклад: 290 асобнікаў.
Выдаецца адзін-два разы на месяц на беларускай і расійскай мовах.

Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы дзеля палемікі, не падзяляючы пазіцыі аўтараў.
Друкуецца на абсталяванні аднадумцаў.
Распаўсюджваецца бясплатна дабраахвотнікамі.